TOWARZYSTWO AMICUS

# my little EUROPE

INTEGRATION EDUCATION CULTURE



Dialogue on the borderland

Mammoths on Biebrza





Love builds, discord ruins

Pine tree – his majesty in the northern forests

Friends Society of Land of Bakalarzewo

NEIGHBOURHOOD PROGRAMME
LITHUANIA, POLAND AND KALININGRAD REGION OF RUSSIAN FEDERATION

**Таварыства Сяброў Бакалажэўскай Зямлі**
– Томаш Нарушэвіч ............................. 114

**ГОТЫКА І ВІЗАНТЫНІЗМ у Вялікім Княстве Літоўскім**



**у XVI ст., ч. 2**
– Праф. Юзэф Марошэк ...................... 116

**Дыялог і вопыт дыялогу на памежжы**
– Докт. Дарота Місеюк ......................... 120

**Сучасныя паланійныя арганізацыі ў Калінінградскай вобласці ч. 2**
– Марыя Лаўрыновіч ........................... 123

**САСНА – КАРАЛЕВА ПАЎНОЧНЫХ ПУШЧАЎ Ч. 1**
– Кшыштаф Вольфрам ......................... 126

**„МАМАНТЫ НАД БЕБЖАЙ"**



– Анна Межыньска ............................... 128

**Любоў будуе – нязгода руйнуе**
– Януш і Войцех Каранкевічы .................. 131

**Вялікісць засялення мястэчак сённяшняй Сувальшчыны ад канца XVIII стагоддзя да 1921 года, ч. 2**
– Томаш Нарушэвіч ............................. 133

**Вяльможны пан кіндзюк**
- Андрэй Федарук ............................... 138

## ДАРАГІЯ ЧЫТАЧЫ



З вялікай прыемнасцю перадаем у Вашыя рукі чарговы нумар "My Little Europe". Знойдзеце ў ім шмат знакамітых артыкулаў, якія прыбліжаюць гісторыю і сучаснасць памежжа. Памежжа, якога спецыфіку і выключны характар хочам паказаць жыхарам аб'яднанай Еўропы.

Польшча, Літва і Калінінградская вобласць з'яўляюцца часткай даўняга Вялікага Княства Літоўскага, якое ёсць узорам для сённяшніх структур Еўрапейскай Абшчыны. Гэтая тэрыторыя, на якой жылі побач сябе шматлікія нацыі і веравызнанні, была адзіным унутрана злучаным і талерантным арганізмам, які аднначасова захаваў своеасаблівую адасобленасць.

Ідэі, прысутныя ў даўніх часах, застаюцца актуальнымі і сёння. Трэба іх вывучыць, паважаць і пераняць.

Спадзяемся, што цыкл прадстаўленых у "My Little Europe" матэрыялаў дазволіць лепш пазнаёміцца з гісторыяй і сучаснасцю тэрыторыі, якая з'яўляецца калыскай супольніцкіх і інтэграцыйных ідэй сучаснай Еўропы.

*Старшыня Таварыства Amicus Пётр Сабалеўскі*

*Рэдакцыйная рада:*
Паўліна Вольфрам
Яраслаў Марэк Хадыніцкі
Адам Казлоўскі
Пётр Сабалеўскі
*Выдаўца:*
Аб'яднанне „Таварыства Amicus"
15-427 Беласток
вул. Ліпова 14
тэл./факс: 0048 85 653 77 53
www.towarzystwoamicus.pl
e-mail: eurobialystok@bia.pl
Выдавецкі Дом „Бэнкоўскі"
15-281 Беласток
вул. Легіёнова 28
тэл.: 0048/85 745 52 45
факс: 0048/85 674 30 22

# ГОТЫКА І ВІЗАНТЫНІЗМ у Вялікім Княстве Літоўскім у XVI ст., ч. 2

**У папярэднім нумары нашага часопіса мы ўзгадвалі рэлігійную гісторыю тэрыторыі (якая з'яўляецца прадметам нашай зацікаўленасці) пачынаючы з 1385 года, калі літоўскі князь Ягайла заключыў з польскім пасольствам дагавор у Крэве. Палякі ахвяравалі яму трон і руку каралеўны Ядвігі. Ягайла ўзамен абавязаўся з цэлай Літвой прыняць хрышчэнне паводле лацінскага абраду.**

**Чарговыя гады аказаліся складаным перыядам уніфікацыі касцёльных спраў і місіі сярод праваслаўных.**



*Сынковічы. Царква св. Міхаіла з пач. XVI ст. Гатычны будынак. Верх. А. Аляксееў, А. Лукашэвіч, Спадчына Беларусі, Менск 2005, с. 197.*

## Смерць Ольбрахта і кіеўскага мітрапаліта

Перашкодай у рэалізацыі касцёльнай уніі сталася смерць кіеўскага мітрапаліта Іосіфа Булгарыновіча, якая, верагодна, наступіла ў канцы 1501 г. У "Маскоўскім летапісе" успамінаецца, што Гасподзь Бог саслаў на Іосіфа хваробу і будучы ўжо хворым стаў мітрапалітам, і памёр пасля года кіравання кіеўскай метраполіяй.

Кіеўскі летапіс сцвярджаў, што Іосіф быў зацверджаны мітрапалітам у 1500 г. (папа Аляксандр VI у дэкрэце з 7 траўня 1501 г. сцвярджаў, што ўчыніў гэта патрыярх Іаакім), па гэтай прычыне выказвецца меркаванне, што смерць мітрапаліта наступіла ў 1501 г.

Сучасны летапіс так характэрызуе час, у якім Іосіф Булгарыновіч быў зацверджаны мітрапалітам: Postaviša mitropolita kievskoho i vseja Rusi Josifa episkopa smolenskoho. Priechal posol z Cargrada ot patriarcha Joakima kartonosec Avraamje i episkop litovskij, Luka polockij, Kiril luckij, Kasjan turovskij. Шматлікае і знакамітае пасольства, якое ездзіла ў Царград, каб атрымаць патрыярхальнае зацверджанне кіеўскага мітрапаліта, указвала на факт, што справа гэтага благаслаўлення дзеля здзяйснення уніі была вельмі істотнай. Унія згодна з уяўленнямі заступнікаў аб'яднання касцёла і царквы мела адбыцца пры адначасовым зацверджанні з Рыму і Царграда.

Іншай перашкодай у заключэнні касцёльнай уніі сталася ўключэнне літоўскага валадара ў выбары на польскі трон. 17 чэрвеня 1501 г. памёр кароль Польшчы Ян Ольбрахт. Аляксандр Ягелончык у другой палове гэтага года шукаў прыхільнікаў, якія падтрымалі б яго ў змаганні за трон Польшчы.

## Масква на варце веравызнання каралевы

Трэба было спыніць маскоўскую вайну. Польскія паслы, якія ехалі ў Маскву, вязлі з сабою ліс-

ты каралевы Галены, адпраўленыя з Вільні 2 студзеня 1503 г.

7 сакавіка 1503 г. пачаліся перагаворы. Тры дні пазней было заключана 6- гадовае перамір'е. Падчас развітання пасол Пётр Мышкоўскі звярнуў увагу на тое, што папа не патрабаваў ад Галены таго, каб яна закінула грэчаскі абрад. Патрабаваў, каб яна приступіла да паслушэнства каталіцкаму касцёлу паводле пастаноў сабора ў Фларэнцыі. Справа заключалася ў тым, каб можна было правесці каранацыю Галены на каралеву Польшчы.

Мышкоўскі склаў прапанову, каб разам пасляць у Рым паслоў польскага і маскоўскага. Тады вялікі князь маскоўскі Іван III змаўчаў справу фларэнцкага сабора і заявіў, што ў яго няма аніякага повада для таго, каб пасылаць да папы пасла ў гэтай справе. Надалей патрабаваў зберажэння Галены ў грэчаскім манастыры, пабудавання ёй замка ў царкве і прызначэння толькі і выключна праваслаўнага двара.

У лісце да Галены Іван III пад пагрозай безупыннай вайны прыказаў, каб засталася пры грэчаскім манастыры.

7 красавіка 1503 г. польскія і літоўскія паслы пакінулі Маскву.

## Паўсюднае перадаванне маёмасці

У тым жа 1503 г. на пасаду кіеўскага мітрапаліта быў пакліканы Іона II, дагэтуль архімандрыт Вазнясенскага Манастыра ў Менску. Яшчэ ў 1503-1504 гг. Іона быў толькі нарачэнным і чакаў благаслаўлення патрыярха. Мяркуецца, што ён быў масквічом і паходзіў з Суздаля.

Некаторыя гісторыкі паказвалі на блізкія сувязі, якія злучалі яго з Галенай, якая асабліва апекавалася менскім манастыром. Звязвалі нават ягоную асобу з прыдворным папом Галены, які быццам бы меў прыехаць з ёю у Літву.

Здаецца аднак, што выключна праваслаўнае становішча Іоны можна растлумачыць і іншай прычынай. Вельмі чалавечай. Дык вось Іона перад тым, як стаў менскім мітрапалітам, меў жонку; пазней стаў удаўцом. Ягоны сын Сямён Крывы ўдзельнічаў у маскоўскай вайне і трапіў у палон. 28 сакавіка падчас заключэнна 6-гадовага перамір'я яго не выпусцілі з турмы. Яшчэ ў 1505 г. Іона як мітрапаліт кіеўскі і цэлае Русі звяртаўся да маскоўскага ўладыкі Сімана ў справе вызвалення сына.

Можна меркаваць, што менавіта сямейныя акалічнасці паўплывалі на тое, што ён не ўключыўся ў справы уніі. Памёр у 1507 годзе.

11 траўня 1481 г. кароль Казімір Ягелончык заявіў кіеўскаму ваяводу Івану Хадкевічу, што дазволіў трокскаму ваяводзе Марціну Гаштаўду купіць ад кіеўскага мешчаніна дом у Кіеве. І вызваліў яго ад гарадскіх падаткаў і іншых цяжараў.

28 лістапада 1502 г. Александр Ягелончык падараваў свайму пісару Івану Сапегу пушчу ў каўнаскім і вількійскім павеце. Цэнтр касцельнай маёмасці знаходзіўся ў Сапяжышках. Была там пабудаваная святыня падобная да гэтай, якая знаходзілася ў Кодні; яна перартрывала да сучасных часоў. Прынятая датацыя вельмі старая. Трэба меркаваць, што яна ўзнікла на пачатку засялення, г. зн. пасля 1502 г.

Святыню св. Духа на замку ў Кодні пабудаваў пэўна Іван Сапега. Калі 5 красавіка 1546 г. Жыгімонт Аўгуст падараваў ягонаму сыну Паўлу Іванавічу Сапегу горад і замак Кодэнь, было пацверджана, што Павал вёў будаўнічую акцыю разам са сваім бацькам. Іван Сапега памёр раней чым 15 лютага 1522 г., таму што тады быў вырашаны палюбоўны прыгавор у справе падзелу спадчыннай маёмасці паміж братоў: Паўла, Міхала і Фрыдэрыка Сапегаў, сыноў Івана, ваяводы падляшскага.

## Роўнасць духавенства

Яшчэ 6 сакавіка 1504 г. у Пётркаве Александр – кароль Польшчы і вялікі князь літоўскі па просьбе ўладыкі холмскага пацвердзіў крыху папсаваную падчас уцёкаў перад татарамі прывілею Уладзіславу III, вы-



*Супрасль. Царква Благавешчання Прасвятой Багародзіцы гатычна-візантыйская. Від з 1910 г. Інстытут Археалогіі Акадэміі Навук у Санкт-Пецярбургу. Фотатэка.*

дадзеную у Будзе 22 сакавіка 1443 г. Згодна з рашэннем пасля заключэння касцельнай уніі з Рымам рускае духавенства (асабліва ў Кароннай Русі і на Падолю) было зраўнаванае з рымакаталіцкім у адносінах свабоды ў касцельнай юрысдыкцыі. Паўсюль у карыстанні атрыманай маёмасці.

Гэты дакумент быў пазней зацверджаны каралём Жыгімонтам III на сойме 5 верасня 1621г.

2 ліпеня 1511 г. на сойме ў Брэсце Літоўскім па просьбе мітрапаліта Іосіфа Солтана і ўсіх рускіх уладыкаў, а таксама гетмана Канстанціна Астрожскага кароль Жыгімонт І зацвердзіў усе правы праваслаўнай царквы згодна з асноўным законам – Намаканонам.

На гэтым жа берасцейскім сойме ў 1511 г. Канстанцін Іванавіч Астрожскі атрымаў прывілею на адбудаванне мітрапаліцкага сабора ў Вільні. Такім чынам была парушана перасцераганая на Літве забарона пабудовы новых праваслаўных цэркваў і іх рамонтаў. Гэта выглядала так: у 1506 г., калі татары разбурылі Менск, Слуцк і Наваградак, апынуліся толькі 70 вёрстаў ад сталіцы. Адбываліся рамонты гарадскіх умацаванняў Вільні. Над берагам Віленкі ў адлегласці ўсяго 11 сажняў ад сабора Прачыстай убівалі частакол. Святыня закалацілася і быў знішчаны яе галоўны купал і сцены, асабліва ўсходняя і паўднёвая.
Праз некалькі чарговых гадоў сабор стаяў у спусташэнні – не аднаўлялі яго па прычыне згаданай забароны.

Мела гэта асноўнае значэнне для сітуацыі царквы ў Вялікім Княстве Літоўскім. Валадар дзякуючы гэтаму акту касаваў рысу рэлігійнай палітыкі сваіх папярэднікаў.



*Сапежышкі (Zapyškis) каля Каўнаса. Гатычны парафіяльны касцёл св. Іаана з 1530 г. фонда Паўла Сапегі.*

Рашэнне разбурала планы вялікіх маскоўскіх князёў, якія бавыя дзеянні супраць Літве вялі пад рэлігійнымі штандарамі - абароны Русі перад уніфікацыяй з каталіцызмам. Зрэшты пералом у палітыцы манарха пачаўся ўжо раней – у перыядзе ліквідацыі ўплываў алігархіі вялікіх літоўскіх паноў і вырашэнняў у справе князя Міхала Агінскага.

Ёст Людвік Дэц'юш, які пасля 1511, але перад 1514 г. пабываў у Вільні, пісаў пра русінаў, што набажэнствы свае адпраўлялі заўсёды ў драўляных святынях і дакладна гэтага прытрымваліся. Але цяпер, у нашыя часы, пераважыла руская справа за заступніцтвам нешматлікіх і вялікім коштам будуюць каменныя святыні на зацверджанне секты. Я сам іх бачыў у Вільні ў гэтым годзе, калі там пабываў, коратка перад бітвай над Днестрам... Людзі гэтай секты займаюць самыя высокія пасады. І лёгка можа здарыцца, што многія для захавання і міласці, і рэлігіі выбярэ маскаля, не караля на валадара.

Пакуль жыў Александр Ягелончык не было і гаворкі пра будаванне новых цэркваў. Ужо Жыгімонт Гербэрштайн, які ў 1526 г. пабываў у Вільні, заўважыў, што ў горадзе на многа больш рускіх цэркваў, чым рымакаталіцкіх касцёлаў.

## Князь Астрожскі, даверaны польскага караля

Вялікае значэнне для пералому ў рэлігійнай палітыцы манарха мела асоба Канстанціна, князя Астрожскага, вялікага гетмана літоўскага, які пасля ўцёкаў з маскоўскай няволі (1500-1507) атрымаў поўны давер караля.

Яго незвычайныя заслугі адрэкамендаваў летам 1509 г. Бер-

нард Вапоўскі (ён прыехаў у Рым разам са світай каралеўскага пасла Эразма Цёлка), які рыхтаваў дакладную запіску аб прычынах і ходзе вайны Жыгімонта Старога з князём маскоўскім Васілём III.

Гісторыю Астрожскага Вапоўскі проціпаставіў гісторыі здрадніка з шалёнымі амбіцыямі – Міхала князя Глінскага, які патаемна (разам з сябрамі русінамі, якія жылі ў ВКЛ) супрацоўнічаў з Масквой і вялікім маскоўскім князём.

Гісторык Вільні міжваеннага перыяду ксёндз Фіялак назваў гетмана Астрожскага другім Ахіллам і адначасова Улісам.

8 верасня 1514 г. у свята Нараджэння Прасвятой Багародзіцы каля Оршы над Крапіўнай гетман Канстанцін Астрожскі адолеў Васіля III. Перамога разбурала таксама антыягелонскую нямецка-маскоўскую лігу.

## Вострая Брама памяткай трыумфу

Некалі пасля грунвальдскай перамогі Ягайла трыумфальна ўехаў у сталіцу Польшчы Кракаў, а ў катэдры св. Станіслава на Вавелю павесіў крыжацкія сцягі. Аднолькава трыумфальны ўезд у апошнія дні верасня 1514 г. прыпаў каралю Жыгімонту I разам з войскамі аб'яднаных польска-літоўскіх сіл пад камандаваннем князя Канстанціна Астрожскага.

Якуб Пісон – папскі пасланец, які ў той час праязджаў праз Вілню па дарозе ў Маскву, апісаў трыумфальнае вяртанне караля. Гэты пасол арыентаваўся ў палітычнай функцыі русінаў у Літве, асабліва паноў і князёў. І сярод іх толькі аднаго Канстанціна, князя Астрожскага выключыў з закіду падступнасці ўласцівай русінам. Апісаў гэта ў лісце адрасаваным Лявону X, далучаным да карэспандэнцыі караля Жыгімонта I і паведамляючай аб перамозе пад Оршай.

Трыумфальны ўезд у Вільню караля Жыгімонта Старога і К. Астрожскага адбыўся не галоўнай Рудніцкай брамай Вільні, але гарадской брамай на медніцкім гасцінцы, якая вяла ў "рускую" частку горада. З той пары (аж па сённяшні дзень) самым важным уездам з'яўляецца Вострая Брама, у яе назве было трывала ўвекавечана прозвішча пераможцы з-пад Оршы. Упершыню Вострая Брама пад такім назовам успамінаецца ў 1556 г.

Зрэшты 30 лістапада 1514 г. кароль даў гетману Астрожскаму ў выніку яго патрабаванняў права пабудаваць побач Вострай Брамы новую царкву св. Тройцы – на ўзгорку горада, кудою ідуць да брамы на медніцкім гасцінцы (дзе знаходзілася старая драўляная праваслаўная царква і манастыр св. Тройцы).

## Пабудова падзячных цэркваў

Думка пабудовы падзячнай святыні з нагоды ваеннага трыумфу не была ў Вільні рэдкасцю. Астрожскі стаў паслядоўнікам дзейнасці Мікалая Мікалаевіча Радзівіла, віленскага ваяводы, які на памятку перамогі над татарамі пад Клецкам 5 жніўня 1506 г. заснаваў на сніпіскім прадмесці касцёл Маці Божай Снежнай (св. Юрыя).

Гетман Астрожскі аб'ясняў каралю у сваіх патрабаваннях, што прысягаў перад бітвай з маскалямі на полю Крапіўна называемым, што калі пераможа непрыяцеля, пабудуе дзве царквы і горадзе Віленскім, з камня або цэглы з самых фундаментаў: адну ў гонар святой і нераздзельнай Тройцы, другую у гонар св. Мікалая, якога Вялікім называюць.

Парадны ўезд пераможных літоўскіх войск праз браму рускага горада і пабудова падзячных цэркваў мелі істотнае значэнне для ментальнасці тагачаснай рускай эліты, якая жыла ў Вялікім Княстве Літоўскім. Умацоўвалі праваслаўнае і каталіцкае грамадства дзяржавы, адрывалі ад маскоўскіх планаў "збірання рускіх земляў".

Калі 24 студзеня 1513 г. у Браславе памерла ўдава па Александры Ягелончыку, яе цела пахавалі ў віленскім саборы Прачыстай, там была таксама размешчана намагільная пліта са славянскай надпіссю і трыма гербамі: маскоўскім, літоўскім і польскім.

Пазней, 4 ліпеня 1522 г. Канстанцін Астрожскі надзяліў дзве альтарыі, якія складалі дзве капліцы саборнай царквы.

*Праф. Юзэф Марошэк*

Неўзабаве Еўропу, Польскую Карону і Вялікае Княства Літоўскае апанавала рэфармацыя. Яшчэ ў 1553 годзе на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага дзейнічала 259 рымакаталіцкіх парафіяльных касцёлаў. З гэтай лічбы ў 1595 г. засталося толькі 119 касцёлаў, г. зн. менш чым палова. Пры традыцыйным каталіцкім веравызнанні засталіся парафіі фонда епіскапаў і караля. У 1595 г. дзейнічала толькі 30 % касцёлаў са шляхецкіх фондаў. Гэта быў паказчык таго, што кальвінскія ідэі былі вельмі папулярныя сярод вернікаў каталіцкага касцёла.